8 клас
Тэст 1.СЛОВАЗЛУЧЭННЕ
Варыянт 1

1. Адзначце якасці, уласцівыя словазлучэнню:
а)не мае інтанацыйнай завершанасці;
б)выражае паведамленне;
в)словы звязаны падпарадкавальнай сувяззю;
г)складаецца з самастойнага і службовага слова.

2. Вызначце граматычнае значэнне словазлучэнняў *блакіт неба, марозная смуга, мая кніга.*
а) азначальныя;
б)дапаўняльныя;
в) акалічнасныя.

3. Адзначце спалучэнні слоў, якія не з'яуляюцца словазлучэн нямі.
а)сто трыццаць першы; в) каля лесу;
б)**купі** хлеба; г) жытнёвае поле.

4. Адзначце іменныя словазлучэнні.
а)нехта з нас; в) сумна без вас;
б)сумуючы па радзіме; г) некранутыя сляды.

5. Адзначце словазлучэнні, у якіх словы звязаны сувяззю**кіра**вання.
а)пакрытыя лесам; в) брама манастыра;
б)бывалі рэдка; г) белыя чайкі.

6. Выпішыце са сказа словазлучэнні, звязаныя сувяззю прымыкання. Абазначце, якой часцінай мовы выражана залежнаеслова:*Мабыць,зіма паварочвала на вясну — мінулі завеі, удзенъ пацяплела, а ўначы браўся мароз. (В. Быкаў.)*

7. Выпішыце са сказа простае дзеяслоўнае словазлучэнне, вызначце від сувязі:
Дзве работы за раз не зробіш.

8. Выпішыце са сказа *Кожны са знаёмых баіць старому абусім, што на свеце дзеецца. (З. Бядуля)* словазлучэнне, якое адпавядае характарыстыцы: непадзельнае, простае, іменнае, сувязь — кіраванне, адносіны — дапаўняльныя.

9. Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчана памылка ў дапасаванні прыметніка да назоўніка.
а)белая гусь; в) шырокая дзвер;
б)вострая боль; г) вялікі шымпанзэ.

10. Перакладзіце на беларускую мову словазлучэнні.
Три пассажирских вагона, болеть гриппом, быстрее ветра, послать за сыном, жениться на красавице, метрах в двадцати, два раза в месяц, рассказывать о друге, смеяться над ним, благодарить отца.

Тэст 1.СЛОВАЗЛУЧЭННЕ
Варыянт 2.

1. Адзначце якасці, уласцівыя словазлучэнню.
   а) складаецца з галоўнага і залежнага слова;
   б) з'яуляецца сродкам зносін;
   в) не мае пунктуацыйнага афармлення;
   г) мае інтанацыйную завершанасць.

2. Вызначце граматычнае значэнне словазлучэнняў *бывалірэдка, едуць далека, уранку пацяплела.*
   а)азначальныя; в) акалічнасныя.
   б) дапаўняльныя;

3. Адзначце спалучэнні слоў, якія не з'яўляюцца словазлучэн нямі.
   а)чародкіасін; в) выходзіць павольна;
   б)самая смачная; г) скончыўся дзень.

4. Адзначце іменныя словазлучэнні.
   а)роўнядзь вады, в) вельмі хацелася;
   б)шчаслівы ад поспеху; г) атрымаў пяцёрку.

5. Адзначце словазлучэнні, у якіх словы звязаны сувяззю**кіра**вання.
   а)баяўся нечага; в) матчына ласка;
   б)спачатку не паверылі; г) далёка ад горада.

6. Выпішыце са сказа словазлучэнні, звязаныя сувяззю прымыкання. Абазначце, якой часцінай мовы выражана залежнае слова: *Неба ўдзенъ ніжэй прыпадае, ціснецца да зямлі.* (М. Стральцоў.)

7. Выпішыце са сказа простае дзеяслоўнае словазлучэнне, вызначце від сувязі
   Адклад не ідзеў лад.

8. Выпішыце са сказа *Гэты незвычайны поезд і сустрэлі за Малай Ліпаўкай партызаны* (І. Чыгрынаў) словазлучэнне, якое адпавядае характарыстыцы: непадзельнае, простае, іменнае, сувязь — дапасаванне, адносіны — азначальныя.

9. Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчана памылка ў дапасаванні прыметніка да назоўніка.
   а)выгадны продаж; в) маленькае калібры;
   б)манная крупа; г) смачнае эсюмо.

10. Перакладзіце на беларускую мову словазлучэнні.

Четыре неизвестных человека, мечтать о счастье, обратиться за помощью, болеть пневмонией, шутить над ним, благодарить учителя, гулять по полям, в километрах двух, похож на отца, слаще сахара.